# ФАРМІРАВАННЕ ПАЎНАЦЭННАГА НАВЫКУ ЧЫТАННЯ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

Савікава Ганна Юр'еўна
УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна"

Авалоданне вучнямі паўнацэнным навыкам чытання з'яўляецца найважнейшай умовай паспяховага навучання ў школе па ўсіх прадметах. Да канца букварнага перыяда ў вучняў, як вядома, выпрацоўваецца навык пескладовага чытання з пераходам на чытанне цэлымі словамі. Арганізуючы працу над развіццём навыку чытання, настаўнік знаходзіць з сутнасці навыку чытання (яго прыроды), а таксама з задач, якія пастаўлены перад урокамі класнага чытання; чытанне ўключае такія кампаненты, як зрокавае ўспрыманне, вымаўленне і асэнсаванне тэксту. Па меры авалодання школьнікамі працэсам чытання адбываецца ўсе большае збліжэнне, усё больш тонкае ўзаемадзеянне паміж названымі кампанентамі (паміж успрыманнем і вымаўленнем, з аднаго боку, і асэнсаваннем – з другога). Тэрмін «чытанне» ўжываецца ў розных значэннях; больш вузкі сэнс – фарміраванне навыку чытання з авалоданнем тэхнікай чытання (перавод графічнай формы слова ў гукавую), у шырокім сэнсе – «чытанне» трактуецца як «тэхніка чытання» плюс разуменне прачытанага (маецца на ўвазе разуменне значэння не толькі асобных слоў, але і сказаў, звязных тэкстаў). Такое дваякае значэнне тэрміна «чытанне» характэрна ў цэлым для псіхолага-метадычнай літаратуры. Мы будзем разглядаць тэрмін «чытанне» ў другім значэнні і разглядаць чытанне, як від маўленчай дзейнасці, у якой ва ўзаемадзеянні выступаюць наступныя кампаненты: а) успрыманне графічнай формы слова, б) пераклад яе ў гукавую форму, г. зн. вымаўленне слова па складах або цалкам у залежнасці ад узроўню авалодання тэхнікай чытання і в) разуменне прачытанага (словы – словазлучэнні – сказы – тэксты). Навык чытання патрабуе працяглага часу для свайго фарміравання. Т. Р. Ягоравым вылучаецца тры этапы працэсу фарміравання навыку чытання: «аналітычны, сінтэтычны і этап аўтаматызацыі». Аналітычны прыпадае на перыяд навучання грамаце і характарызуецца складова-літарным аналізам і чытаннем слоў па складах. Для сінтэтычнага этапу характэрна чытанне цэлымі словамі; пры гэтым зрокавае ўспрыманне слова і яго вымаўленне амаль складаецца з усведамленнем яго значэння. Больш за тое, разуменне сэнсу слова ў структуры словазлучэння ці сказа апярэджвае яго вымаўленне, г. зн. чытанне ажыццяўляецца па сэнсавай здагадцы, на сінтэтычнае чытанне вучні пераходзяць у III класе. У III – IV класах чытанне ўсё больш аўтаматызуецца, гэта азначае, што сам працэс чытання ўсё менш ўсведамляецца вучнямі і на першы план вылучаецца

ўсведамленне тэксту: фактычнага зместу, кампазіцыі, ідэйнай накіраванасці, выяўленчых сродкаў і г. д.

У апошняе дзесяцігоддзе ў метадычнай тітаратуры вялікая ўвага надаецца пытанню узаемаабумоўленнасці фарміравання навыкаў чытання і фарміравання ўменняў працаваць з тэкстам. Выказваецца думка пра тое, што на ўроках чытання неабходна працу над творам арганізаваць так, каб аналіз зместу адначасова быў накіраваны і на ўдасканаленне навыку чытання (заданні арыентавалі б на ўсвядомленае чытанне тэксту). Даследчыкамі было ўстаноўлена, што для фарміраванняў паўнацэннага навыку чытання нават у кароткія тэрміны станоўчы ўплыў аказвае сістэматычнае выкананне практыкаванняў у чытанні (у тым ліку паслядоўнае навучанне чытанню пря сябе). У метадычнай літаратуры распрацавана дастаткова поўная характарыстыка навыку чытання. Вывучаюць чатыры бакі навыку чытання: правільнаць, свядомасць, бегласць, выразнасць.

Пад правільнасцю чытання разумеецца чытанне без скажэнняў: правільна перадаецца складова-літарны склад слова, граматычныя формы слова, не дапускаецца пропускаў і перастановак слоў у сказе. Прычыны памылковага чытання ў вучняў пачатковых класаў (як у чытальнікаў з несфарміраваным навыкам чытання) заключаюцца ў тым, што ў іх няма гнуткага сінтэзу паміж успрыманнем, вымаўленнем і асэнсаваннем успрымання тэксту. У дасведчанага чытальніка (згодна з даследаваннямі псіхолагаў) сінтэз трох названых кампанентаў адрозніваецца гнуткасцю і рухомасцю; таму сэнсавыя загадкі, якія суправаджаюць іх чытанне, рэдка вядуць да памылак. У пачаткоўца-чытальніка сэнсавая здагадка значна часцей можа быць прычынай няправільнага ўспрымання, а затым і вымаўлення слова, так як працэс ўспрымання і працэс асэнсавання яшчэ не так лёгка і хутка ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Як паказвае школьная практыка і спецыяльныя даследаванні, вучні часцей скажаюць (замяняюць) тыя словы, сэнсу якіх яны не разумеюць, г. зн. словы, паміж успрыманнем і асэнсаваннем якіх узаемадзеянне мінімальнае. У мэтах папярэджання памылак мэтазгодна: а) высвятленне перад чытаннем лексічнага значэння слоў, без разумення сэнсу якіх ўспрыманне тэксту абцяжарана, б) папярэдняе паскладовае чытанне слоў, якія маюць складаны складовы або марфемны склад, в) стварэнне на ўроках сітуацыі для ўважлівага чытання тэксту (у прыватнасці, выразнасць заданняў), г) папярэдняе чытанне тэксту пра сябе, д) з мэтай усведамлення зместу і падрыхтоўкі да чытання ўслых – сістэматычы кантроль з боку настаўніка за чытаннем школьнікаў з улікам іх індывідуальных асаблівасцяў, е) метадычна правільнае выпраўленне памылкі ў залежнасці ад яе характару (напрыклад, памылкі ў канчатках слоў настаўнік можа выправіць, не перарываючы чытанне вучня; памылку, у выніку якой змяніўся сэнс сказа, настаўнік выпраўляе, выкарыстоўваючы

прыём паўторнага чытання, ставіць пытанне па змесце прачытанага, вучань больш уважліва паўторна чытае сказ).

Бегласць чытання характарызуецца вызначанай колькасцю слоў, якія вымаўляюцца ў хвіліну. Як вядома, тэмп чытання вучняў да канца першага года навучання складае 30-40 слоў у хвіліну, да канца II класа – 60-80 слоў, да канца III – 80-90 слоў, IV – 90-120. Тэмп чытання расце паступова на працягу ўсіх чатырох гадоў навучання і знаходзіцца ў пэўнай узаемасувязі з чытаннем – правільным і свядомым. Хуткасць чытання па-за сувязі з разуменнем прачытанага не апраўданая. Правяраючы бегласць чытання, настаўнік ўлічвае складанасць тэксту (маецца на ўвазе ідэйна-тэматычны змест, структура слова і сказаў, распаўсюджанасць слоў у маўленні і г.д.), а таксама правільнасць і свядомасць чытання.

Для развіцця ў вучняў бегласці чытання неабходна сістэматычна працаваць, чаму спрыяе, перш за ўсё, зацікаўленасць школьнікаў у чытанні, жаданне і патрэба чытаць кнігі. Дзеці, якія любяць чытаць, як правіла, ужо ва II класе чытаюць бегла. На развіццё тэмпу чытання station станоўчы ўплыў аказвае таксама характар заданняў, якія яны выконваюць, працуючы над тэкстам. Заданні павінны падахвочваць да перачытвання тэксту з мэтай больш асэнсаванага яго ўспрымання (напрыклад, падбор матэрыялу для пацвярджэння правільнасці свайго меркавання, падрыхтоўка да пераказу, да славеснага малявання і г. д.). Настаўніку неабходна загадзя планаваць работу на ўроках так, каб, выконваючы рознага роду заданні, амаль усе вучні на працягу ўрока чыталі ўслых. Асаблівай увагі заслугоўвае развіццё ў вучняў умення чытаць пра сябе. Свядомасць чытання абумоўлена разуменнем малодшымі школьнікамі фактычнага зместу тэксту, ідэйнай накіраванасці твора, яго вобразаў і ролі мастацкіх сродкаў, а таксама правільным уласным стаўленнем вучня да твора. У сваю чаргу, гэта залежыць ад наяўнасці ў школьнікаў неабходнага жыццёвага вопыту, ад разумення лексічнага значэння слоў, іх спалучальнасці ў структуры сказа і ад шэрагу метадычных умоў. Такая тракотоўка свядомасці чытання гістарычна склалася ў методыцы і стала традыцыйнай. Значны уклад быў унесены К. Дз. Ушынскім. У цяперашні час тэрмін «свядомасць чытання» выкарыстоўваецца ў літаратуры і ў школьнай практыцы ў двух значэннях. Падобна да таго, як «чытанне» ўжываецца ў розных значэннях, так і тэрмін «свядомасць чытання» можа ўжывацца ў дачыненні да авалодання самім працэсам чытання (тэхнікай чытання) і ў дачыненні да чытання ў больш шырокім сэнсе слова (свядомасць як якасць, адна з бакоў чытання). Свядомасць самога працэсу чытання залежыць ад таго, наколькі  вучні валодаюць складова-літарным і гукавым аналізам слова, умеюць суадносіць літару і гук, улічваюць становішча гука ў слове і ўплыў суседства іншых гукаў, зліваюць склады ў адзін комплекс-слова, г.зн. свядома выконваюць тыя аналітыка-

сінтэтычныя аперацыі, якія ў выніку вядуць да правільнага ўзнаўлення гукавой формы слова на аснове графічнага абазначэння.

Такім чынам: свядомае чытанне слоў, словазлучэнняў і сказаў найцяснейшым чынам звязана з разуменнем сэнсу кожнай з названых моўных адзінак.